УДК 821.161.3-32

**Н. М. БОРСУК**
Беларусь, Брэст, БрДТУ

# ВОБРАЗ БЕЛАЙ ВЕЖЫ Ў МАСТАЦКІМ АСЭНСАВАННІ БЕЛАРУСКІХ ПАЭТАЎ

Камянецкая вежа – візітная картка горада Камянца. Ужо з XVI стагоддзя горад атрымаў Магдэбургскае права і на яго гербе з’явілася вежа. Самотны сярэднявечны стоўп нясе варту над ракой Лясной. Яго сцены сталі маўклівымі сведкамі гісторыі краю. Выявы гэтага гістарычнага помніка мы сустракаем на паштоўках, сувенірных вырабах. «Белай вежай» названы тэатральны фестываль, творчае аб’яднанне, база адпачынку, санаторый, магазін, нават цукеркі і г. д. Даніну ўвагі аддалі Белай вежы і беларускія пісьменнікі, выказалі захапленне самабытнасцю, загадкавасцю, непаўторнасцю гэтага гістарычнага помніка. Зварот да канкрэтных твораў нашых сучаснікаў дае магчымасць убачыць розныя ракурсы мастацкага адлюстравання Белай вежы.

Прачулымі радкамі верша «Галубовую мрою наіўнасці» [1, с. 161] З. Дудзюк адгукнулася на хараство навакольнай прыроды, з якой гарманічна з’ядналася Белая вежа. Лірычная гераіня вучыцца даражыць шчаслівымі хвілінамі кахання, сумоўя з роднымі краявідамі. Толькі чалавек, душа якога здольна адгукацца на хараство, можа заўважыць, як «зоркі жніўня» сыплюцца «Белай вежы ў цагляны рукаў», як «песціцца рэчка Лясная». Стварыць паэтычны вобраз мастачкі слова дапамагаюць такія сродкі мастацкай выразнасці, як увасабленне, метафары, эпітэты. Здаўна за помнікам гісторыі замацавалася азначэнне «Белая вежа», хаця вядома з архіўных дакументаў, малюнкаў Напалеона Орды, што пабудавана вежа з цёмна-чырвонай і жаўтаватай брусчатай цэглы.

Сёння мы можам выказаць некалькі версій па гэтаму пытанню. Па-першае, вежа не была разрабавана мясцовымі жыхарамі, яна выстаяла падчас шматлікіх аблог, не была спалена. Паэтычны доказ выказанай версіі знаходзім у вершы А. Лойкі «Белая вежа» [1, с. 129]: «Цябе назвалі светла – Белай вежай. / Ці не па той жа сонечнай прычыне, / З якой і край увесь – палі, лугі – / Назвалі ўсеабдымна Белай Руссю?..» Па-другое, вежа была пабелена в 50-я гады XX стагоддзя і аздоблена флагам, чырвонай зоркай і надпісам «40 лет Октября» (ёсць меркаванне мясцовага свяшчэнніка Л. Паеўскага, згодна якому вежу ў старажытнасці бялілі). Менавіта такой яна запомнілася не аднаму пакаленню маладых творцаў. І толькі ў 1998-м годзе пабелку змылі альпіністы. Па-трэцяе, аўтар манаграфіі «Белавежская пушча» (1903) Георгій Карцаў напісаў, што Камянецкая вежа стаіць на Белай рацэ, хаця рэчка мела назву Лясная. Адсюль і пашла назва Белая вежа. Думаецца, кожная версія мае права на існаванне.

У сувязі з гэтым цікавасць выклікае вобраз-сімвал «бярозы каменнай краю майго» (верш К. Камейшы «Белая вежа» [1, с. 143]). У аснову параўнання вежы з белай бярозай пакладзены не толькі белы колер, нягледзячы на тое, што ў тэксце ёсць прамыя ўказанні на гэта: «І як ні паліў цябе / скрушны агонь, / А ты

яшчэ болей бялела ў агні»; «І бачыцца выраю шлях / у мой край / Па белым тваім маяковым святле». Думаецца, важную ролю для асэнсавання вобраза-сімвала мае сакральнае значэнне дрэва бяроза, уяўленні пра яго жыццёвую моц, вывядзенне на пярэдні план медыятыўных якасцяў дрэва, якія, акрамя звязвання паміж сабой двух супрацьлеглых сфераў, уключалі і функцыю іх размежавання, абумовілі выкарыстанне бярозы як сродку, здольнага супрацьстаяць злому пачатку, абараніць ад пранікнення смерці: «Свяціла ты пушчы – / і вечнасць сама / У белым тваім паўставала святле».

Побач з вежай утульна і Віктару Шніпу. Любіць бываць паэт у гэтых мясцінах летнім вечарам. Прыемна ўсведамляць яму, што ёсць Белая вежа, як сонца над ёю, / Як слова «люблю» над душою маёю, /.. / Як сэрцаў цяплынь у завейнасць зімы, / Як крык журавоў, што не хочуць ляцець / Ад нас на чужыну, як восені медзь / Не хоча знікаць у дарожнай гразі». Адначасова лірычны герой Віктара Шніпа адчувае сябе абароненым. Любоў да Беларусі, народа перапаўняе яго сэрца. Паэтычны твор цалкам пабудаваны на параўнаннях (вежа параўноўваецца са святлом, «якое не знікла, з зямлі прарасло», са стражнікам, з помнікам людзям, што жылі / І ў гэту зямлю адышлі»), дзякуючы якім у творы выразна прасочваецца слушная думка: покуль ёсць такія помнікі старажытнасці, мы «не згубімся ў пыле дарог». Невыпадкова беларускі паэт абраў для выражэння сваіх думак жанр балады – «Балада Белай вежы» [1, с. 176]. Тут адчуваюцца і драматычная напружанасць, і лірычная спавядальнасць, і прысутнасць казачна-фантастычнага і легендарна-гістарычнага, гераічнага. Віктар Шніп, падобна скульптару, вядзе размову з чытачом моваю сімвалаў і вобразаў: «І Белая вежа, як Ноеў каўчэг, / Плыве праз дажджы, праз стагоддзі, праз снег...». Як бачна, паэта не пакідае надзея гарманічна аб’яднаць дысгарманічныя тыпы людзей, пазначаныя працэсам амасаўлення, дэіндывідуалізацыі. І ў гэтым важная роля, па перакананні мастакоў слова, належыць помнікам культуры.

Нібы ў працяг думкі В. Шніпа Міхась Рудкоўскі (верш «Камянецкая вежа») [1, с. 139] надае ўвагу выхаванню ў маладых людзей пачуцця годнасці за сваіх продкаў, сваю зямлю. Веданне слаўнай гісторыі вежы, якая «не здымала ў бітвах, скрухах / Ні перад кім ні разу свой шалом, / Ні перад кім не біла ты чалом – / Была заўсёды непакорнай духам», дазваляе з упэўненасцю глядзець у будучыню – «глядзіш спакойна ў далі з-пад рукі, / Дзе некалі расправяць, быццам птахі, / Да ўзлёту крылы новыя вякі».

Лірычны герой верша Віктара Гардзея «Белая вежа» [1, с. 146] ўсведамляе далучанасць продкаў да спраў сучаснікаў і нашчадкаў нават і пасля смерці: «Аддана тут продкі служылі зямлі, / А сёння іх слава ёй служыць». А гэта ў сваю чаргу абавязвае маладых людзей да самаахвярнасці на карысць Бацькаўшчыне, беларускаму народу... Начныя дазорцы – гэта не проста звычайныя вартаўнікі вежы. Гэта – гістарычны, духоўны вопыт народа, што здольны супрацьстаяць злу, дапамагае асэнсаваць трывогі сённяшняга дня ў сувязі часоў, у дыялектыцы іх пераемнасці і абнаўлення: «Дазорцы стаяць у сцішэлай начы, / Бясстрашна і думна глядзяць на дарогу. / А з’явіцца вораг – і зноў трубачы / Пратрубяць, / як колісь, / трывогу».

Пуцяводнай зоркай паўстае Белая вежа з аднайменнага верша А. Лойкі. Дзякуючы выкарыстанню выклічніка «О,...» («О, колькі ліўняў над табой шумела»; «О, колькі ніспадала бліскавіцаў»; «О, стань жа літарай – вялікай, загалоўнай»), лагічнаму, апраўданаму выкарыстанню анафары (Каб змыць цябе, стачыць імхом і цвіллю, / Каб і ні следу ў мураговым дзёрне»; «І толькі сонца ты страчала госцем, / І месяц ясны моўчкі падпірала»), узмацняецца рытм твора, кожны паэтычны радок становіцца больш яркім і пераканаўчым, а думка – больш прыкметнай і адточанай. Лірычны герой А. Лойкі адчувае сябе адказным за ўсе, што дзеецца ў родным краі: «Я зноў і зноў лячу, лячу к табе / Праз ліўні, навальніцы, завірухі – / Былыя і ўсе тыя, ад якіх / Цябе ўжо захінаць я абавязаны».

Белая вежа выступае як помнік старажытнасці, як сімвал гісторыі народа. Таму яна часта адухаўляецца, набываючы рысы жывой істоты. У дыялог з нашым сучаснікам уступае Белая вежа ў вершы Б. Спрынчана (верш «Белая вежа») [1, с. 123], М. Пракаповіча «Белая вежа» [1, с. 156]: «... Нам адведзены час кароткі, – / Чым пазначым мы гэты час? / Вочы ў вочы – з байніцаў продкі / Запытальна глядзяць на нас». Першыя радкі верша Б. Спрынчана («Замер я в притихшей веже, / Как в патроннике патрон») настройваюць нас на ўспрыманне пачуццяў лірычнага героя, якія ўзнікаюць пад уплывам наведвання ім цудоўнага помніка архітэктуры XIII стагоддзя. Час Камянецкага слупа вымяраецца стагоддзямі: «Я аукнул – эхом гулким / Семь веков отозвалось». Рытарычныя пытанні (Или отзвук рукопашный / Вдруг донёсся до меня?..), антытэзы (павших, но не сдавших башни) выкарыстаны з мэтаю падкрэсліць асаблівае гісторыка-пазнаваўчае значэнне старажытнай гатычнай вежы. «Башня эта в народе и в летописях называтся столбом. Она сохранилась и до наших дней. Столб имеет в вышину 17, в окружности 16 сажен; верх зубчатый. Три очень узкие окна в виде амбразур. Сохранились даже погреба, коих своды поражают своею прочностью и превосходною отделкою. Башня эта или столб составляет драгоценный памятник зодчества XIII ст. Она воздвигнута в 1276 г. князем Владимиром Васильковичем Владимирским. Его считают основателем Благовещенской церкви и самого города, хотя не подлежит сомнению, что поселение здесь существовало с древнейших времён», – адзначае Адам Кіркор, гісторык, этнограф, археолаг, выдавец, грамадскі дзеяч, у працы «Города и поселения в Литве» [1, с. 57].

Вышэйузгаданы факт паэтычна адлюстраваны ў вершы Анатоля Астрэйкі «У Белавежы» [1, с. 98]: «Без лат, у латах і брані, / Чые, чые тут ногі не хадзілі? / Адсюль Радзіму бараніў / З дружынаю Васількавіч Уладзімір». Трэба адзначыць, што Белая вежа ўспрымаецца пераважнай большасцю мастакоў слова як канкрэтны помнік ля пушчы, «выдатны помнік даўніны», «як гонар беларускага народа». І не толькі таму, што Камянецкая вежа спазнала нямала выпрабаванняў: не раз, пачынаючы з 1373 г., на горад нападалі рыцары-крыжакі, войскі польскіх і літоўскіх князёў, а падчас чарговай вайны паміж Рэччу Паспалітай і Маскоўскім царствам горад і яго ўмацаванні так пацярпелі, што Сейм быў вымушаны ў 1661 г. вызваліць Камянец ад падаткаў на 4 гады, пакутаваў горад і ад марадзёраў, якія ў XVIII ст. панадзіліся выкалупваць з вежы цэглу на гаспадарчыя патрэбы. Камянецкая вежа, на наш погляд, мае вельмі шчаслівы лёс, таму што толькі яна захавалася ў цэлым. І як вынік – на Камянеччыне мы маем магчымасць дакрануцца да гісторыі XIII стагоддзя.

Нельга не ўлічваць той факт, што Камянецкі стоўп – гэта перш-наперш абарончая вежа (вежы валынскага тыпу былі пабудаваны ў Брэсце, Тураве, Гродне, Валынску, Чартарыйску, Холме, Луцку, Полацку, Навагрудку). На гэта ўказвае ў рамане «Уліс с Прускі» беларускі пісьменнік Уладзімір Гніламёдаў, для якога малая радзіма – гэта Камянеччына: «Камянец – тыповы беларускі сярэдневяковы гарадок, мястэчка, заснаванае яшчэ ў XIII стагоддзі. Тады ж валынскім князем Уладзімірам Васількавічам – «вялікім кніжнікам і філосафам» – быў пабудаваны славуты Камянецкі стоўп – высокая абарончая вежа, від на якую адкрыўся нашым падарожнікам з Бабіцкай гары. Мястэчку ў вялікім княстве надавалася немалое дзяржаўнае значэнне» [1, с. 197].

Любоўю да «краю дзяцінства й маладосці» прасякнуты дыптых «Вяртанне да Камянца» Васіля Жуковіча [1, с. 233]: «Мне, Камянец, краса твая / Ніколі не была халоднай». Паэт узгадвае ў паэтычных радках сваіх родзічаў, аснову іх гаспадарчага жыцця, якую складалі земляробства на камяністых землях, паляванне, сплаў лесу. З болем успамінае, што «ад старажытнасці сівой / Захопнікі тут не драмалі, / Багаты край пушчанскі мой / Капыцілі і рабавалі». «Незабыўны гарадок / ... / Ад цэркаўкі да Белай вежы» творча наталяў будучага паэта, дапамагаў яму расці духоўна: «Перад красой тваёй святой / Ўсе прызабуду прыгажосці».

Жыццё і смерць заўжды ідуць побач. Для лірычнага героя верша Мікалая Цялічкі «Ах, попутчик мой, ветер свежий» [1, с. 120], які прайшоў Вялікую Айчынную вайну, гэтыя паняцці атаясамліваюцца з жытнім полем і Камянецкай вежай: «Вспоминаю, как в поле копны / И как поле, ржаное сплошь, / С Белой вежи да из окопа / Отбивать у врагов пришлось».

У 1960 годзе вежу занеслі ў Спіс помнікаў гісторыі і культуры. Паэтычнае двухрадкоўе «Жыві ж, красуй на радасць, асалоду / Зямлі, і сонца, і вясны» гарманічна дапаўняецца празаічным. Вежа атрымалася падобна «удивлению всем зрящим на него», – чытаем у Галіцка-Валынскім летапісу. Вобраз Белай вежы часта ўпісваецца паэтамі, як ужо адзначалася раней, у канкрэтны прыродны краявід, у прыватнасці, цесна пераплятаецца з апісаннем Белавежскай пушчы: «Ад вежы далей адступілі нетры, / Зубрам каб зберагчы спакой. / Шуміць, гуляе пушча з ветрам / На рэчках Белай і Лясной». Гэтая думка выразна прасочваецца і ў паэтычных радках Казіміра Камейшы [1, с. 143]: «Над вечнай страхою / пушчанскіх бароў / Стаіш ты, / гайдаеш аблокаў вясну. / І белае стволле тутэйшых бяроз / Табе аддае сваю ўсю белізну».

На думку Казіміра Камейшы (верш «Белая вежа»), кожны наведвальнік музея «Белая вежа» адчувае на сабе дабратворны ўплыў гэтага храма мужнасці, шчырай упэўненасці ў непахіснасці маральных ідэалаў мінуўшчыны: «Ты – белая крэпасць маёй чысціні». Любоў да Радзімы заўжды была крытэрыем вымярэння сутнасці чалавечай асобы і праяўляецца яна найбольш поўна тады, калі чалавек на час разлучаецца з радзімаю зямлёю [1, с. 146].

Аналіз твораў беларускіх мастакоў слова, прысвечаных Белай вежы (В. Жуковіча, У. Гніламёдава. К. Камейшы, З. Дудзюк, А. Астрэйкі, М. Цялічкі, В. Шніпа, Б. Спрынчана, А. Лойкі, В. Гардзея), паказаў: існуе некалькі розных ракурсаў мастацкага адлюстравання гэтага вобраза,

у прыватнасці, як помніка культуры, як сімвала Беларусі, малой радзімы, гісторыі, магутнай сілы беларускага народа, духоўнага сталення чалавека. Невыпадкова са старонак паэтычных твораў Белая вежа прадстае то ў вобразе ваяра (М. Пракаповіч), то стражніка (В. Шніп).

Вершы кранаюць сваёй непасрэднасцю, лірызмам. Гэта не дзіўна. Белая вежа належыць да ліку тых светлых вобразаў-сімвалаў, зварот да якіх не дазваляе фальшывіць, прыстасоўвацца, спрыяе паглыбленню філасофска-маральных аспектаў творчасці мастакоў слова. Мы павінны вучыцца цаніць багатую спадчыну, што дасталася нам ад продкаў: «Прарастае з нябыту памяць – / І ў наструненай цішыні / Белай птушкай плыве над намі / Да тваёй святой чысціні» (верш М. Пракаповіча «Белая вежа»).

**СПІС ЛІТАРАТУРЫ**

1. Песні Белавежы: Камянеччына літаратурная: проза, паэзія, публіцыстыка / уклад. З. Дудзюк. – Минск : Маст. літ., 2005. – 310 с.

УДК 72.03:81’373.2(476.7)

**Н. Н. ВЛАСЮК (ст.)**
Беларусь, Брест, БрГТУ

## СТРАТИГРАФИЯ ИСТОРИЧЕСКИХ УРБАНОНИМОВ XIX–XXI ВВ. МИКРОРАЙОНА ГРАЕВКА Г. БРЕСТА

Специфика исторических урбанонимов Бреста в том, что на протяжении последних, неполных 200 лет город входил с состав различных государств: Российской империи, Украинской Народной Республики и Украинской державы, Второй Речи Посполитой, СССР (БССР), Республики Беларусь, был оккупирован кайзеровской Германией и Третим рейхом в годы мировых войн. Поэтому при разработке научно-проектной документации на реставрационно-восстановительные процессы материальных недвижимых историко-культурных ценностей, исследовательская работа в архивах затрудняется поиском адреса объекта в разные временные периоды.

Приведенная ниже, в виде таблицы, стратиграфия исторических наименований элементов улично-дорожной сети (урбанонимов) XIX–XXI вв. является инструментом для исследователей и архитекторов-реставраторов исторической застройки Бреста (при разработке раздела КНИ проекта реставрации), аутентичный иконографический материал которой хранится в государственных архивах Беларуси, России, Польши, Литвы, Латвии и Украины. Возможно, часть документов находится в архивах ФРГ, которые не исследованы автором. В данном исследовании впервые рассматривается историческая топонимия бывших рабочих железнодорожных поселков «Граевская Слободка» и «Березовская (Киевская) Слободка». Все топонимы, приведенные в таблице, даны на языке оригинала, в том числе с аутентичными орфографическими ошибками, допущенными авторами в период составления документов.